# Школа добрых чарадзеяў

## Урок пазакласнага чытання паводле твораў М. Пазнякова ў рамках акцыі "Чытаем разам"

**ЗАДАЧЫ:** пазнаёміць з пісьменнікам М. Пазняковым, тэматычнай і жанравай разнастайнасцю яго твораў; пашыраць чытацкі вопыт вучняў; фарміраваць станоўчую матывацыю да чытання, уменні самастойнай працы з кнігай; развіваць пазнавальную цікавасць, маўленне, увагу, мысленне, творчыя здольнасці; выхоўваць чытацкую культуру, добразычлівыя адносіны да людзей, любоў і павагу да членаў сям'і, клапатлівыя адносіны да прыроды, пашану да Радзімы.

**АБСТАЛЯВАННЕ:** выстава кніг М. Пазнякова; мультымедыйная прэзентацыя; званочак; карткі для гульняў "Уважлівы чытач" і "Літаратурнае фоталато"; папера для запісаў; аўдыязапісы песень на словы М. Пазнякова "Каму вадзіць?", "Тварыце, людзі, на зямлі дабро!"; папяровыя рамонкі для рэфлексіі.

**НА ДЫСКУ:** мультымедыйная прэзентацыя, вершы, карткі.

У мерапрыемстве ўдзельнічае беларускі пісьменнік М. Пазнякоў.

Усе творы, выкарыстаныя ў сцэнарыі, належаць яго пяру.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### Ход урока

**I. АРГАНІЗАЦЫЙНЫ МОМАНТ. ПАВЕДАМЛЕННЕ ТЭМЫ ЎРОКА.**

**Настаўнік.**
Нам кніга — вечнае святло,
Крыніца ведаў, цуд бясконцы!
І параўнацца з ёй магло б,
Відаць, у свеце толькі сонца.

Сёння ў нас незвычайны ўрок пазакласнага чытання. Мы будзем разважаць на важныя тэмы, якія падказалі нам творы для дзяцей Міхася Паўлавіча Пазнякова.

Дзеці вітаюць пісьменніка.

**II. УСТУПНАЯ ГУТАРКА.**

? Ці ведаеце вы, хто такія чарадзеі? Хто і як можа стаць сапраўдным чарадзеем? Ці хацелі б вы стаць добрымі чарадзеямі?

**Настаўнік.** Дзіцячы пісьменнік таксама чарадзей. Сёння ў нас ёсць магчымасць паразважаць на гэту тэму разам з вядомым беларускім пісьменнікам Міхасём Паўлавічам Пазняковым. Будзе вельмі цікава даведацца, якімі былі першыя крокі Міхася Паўлавіча ў дзіцячай літаратуры.

**III. ВЫСТУПЛЕННЕ ПІСЬМЕННІКА.**

**IV. УРОКІ Ў ШКОЛЕ ДОБРЫХ ЧАРАДЗЕЯЎ.**

**Настаўнік.** У Школе чарадзеяў, як і ва ўсіх школах, праводзяцца ўрокі. Увага! Пачынаецца першы ўрок *(дае званок)*.

**Урок сямейнай цеплыні**

? Што для вас значыць слова "сям'я"? Каго ў вашай сям'і вы можаце назваць добрымі чарадзеямі? Чаму? Якія жыццёвыя ўрокі даюць вам вашы бацькі, бабулі і дзядулі, іншыя члены сям'і? Якія творы пра сям'ю Міхася Пазнякова вы чыталі? *(Вершы "Памочніца", "Побач з татам", "Мой дзядуля", "У выхадны" і інш.)*

Вучням раздаюцца карткі, на якіх запісаны пераблытаныя радкі з вершаў — іх трэба размясціць правільна. Адказы правяраюцца па слайдах.

Памагаю ёй таксама.
І, калі гатуе мама,
Я абед варыць вучуся,
Працаваць я не лянюся.

Шмат займальнага раскажа.
З ім нічога не баюся,
Дапаможа ён, падкажа,
Я дзядулем ганаруся,

З добрым настроем у парк.
І на прагулку кіруе
Дружна сям'я ўся працуе,
Потым абедае ўсмак.

Збажыну ўбіраю.
Горда пазіраю.
Еду з татам на камбайне,
У прастор бяскрайні

**Настаўнік.** Малайцы! Выдатна справіліся з заданнем!

? Як вы лічыце, ці карыснае такое заданне для чытачоў? Чаму яно навучыла вас? Што агульнага паміж вершамі, з якімі вы зараз працавалі? *(Тэма сям'і.)*

Падрыхтаваны вучань выразна чытае верш "Маміны рукі":

Слава маміным рукам,
Што работу любяць
І прыносяць сонца нам,
Ласкаю галубяць.
Слава маміным рукам,
Найцудоўным самым!
Нізка кланяемся вам,
Дарагія мамы.
Слава маміным рукам.
Хай на ўсёй планеце
Кветкамі для мілых мам
Расцвітаюць дзеці!

?! Якія пачуцці да мамы вы адчулі ў гэтым вершы? Чаму матулю часам называюць добрай чараўніцай? Якім сакрэтам добрых чарадзеяў яна вучыць вас? Давайце паспрабуем зрабіць абагульненне. Што дапамагае людзям стаць добрымі чарадзеямі для сваёй сям'і?

**Урок адчування прыгажосці прыроды**

? Хто з вас лічыць сябе назіральным, уважлівым чалавекам, які клапоціцца аб прыродзе? Якія творы аб прыродзе Міхася Пазнякова вы чыталі?

***Гульня "Літаратурнае фоталато"***

На партах — карткі з урыўкамі вершаў М. Пазнякова. На экране з'яўляюцца пейзажныя замалёўкі. Трэба знайсці на картцы той урывак, які словамі апісвае прапанаваны фотаздымак.



Паспелі з краю ў край
І жыта, і пшаніца.
Багаты ўраджай
На сонцы залаціцца.

Я ў дзяцінстве любіў завіруху,
Забіраўся ў глухі закутак,
І дыханне затойваў, і слухаў
Чыстазвонны яе гаварок.



Важна ходзяць у бары
Самавітыя зубры.
На паляне, на развілку —
Нібы волаты-асілкі,
Што спрадвеку збераглі
Дух няскоранай зямлі.



З кожнай спелай ягадай
Павітацца рады я.
Для мяне заўсёды
Яны — цуд прыроды.



Пасадзіў у садзе я
Яблыньку малую
І цяпер яе штодня
Берагу, шаную.



? Як павінен ставіцца да прыроды чалавек, каб захаваць непаўторную прыгажосць нашых лясоў, палёў, рэк, азёр?

Падрыхтаваны вучань чытае верш "Бярозка":
Стаіць яна на ўзлеску,
Каля густых ялін,
І золата на сцежку
Плыве з яе галін.
Усмешкаю святлістай
Праменіць у вышынь.
Гляджу я — і ўрачыста,
Святочна на душы.

Ніяк не надзівіцца.
Іду, удзячны госць,
А музыкай бруіцца
Бярозкі прыгажосць.
Шануй яе, хлапчына,
Не гні і не ламай.
Вясной на сок (загіне!),
Глядзі, не надразай.
Запомні: ёй таксама
Балюча кожны раз.
Прырода нам як мама,
Што нарадзіла нас.

Чаму навучыў вас гэты верш? Як вы разумееце апошнія радкі верша? Як стаць добрым чарадзеем для прыроды?

**Урок сяброўства і добразычлівасці**

Што значыць слова "сяброўства" для кожнага з вас? Каго можна назваць сябрамі? Як навучыцца сябраваць? Што такое добразычлівасць? Ці сустракаліся вам творы Міхася Пазнякова пра сяброў? Прывядзіце прыклады.

Вучні разам чытаюць скорагаворку *(слайд 20)*:

Паклікаў Рыгорка
Ягорку на горку.
Добра з Рыгоркам
На горцы Ягорку.

Якія гукі найбольш часта сустракаюцца ў скорагаворцы? Навучыцеся шэптам вымаўляць скорагаворку. Паступова павялічвайце тэмп. Выразна вымаўляйце гукі [р], [г].

Вучні ў парах вымаўляюць скорагаворку.

***Гульня "Адгадваем загадкі з сябрамі"***

Настаўнік загадвае загадку, вучні запісваюць адгадку на аркушы паперы.

У бацькі — дванаццаць
Малойцаў-сыноў,
Адвечных рупліўцаў
І шчырых сяброў.
***(Год і 12 месяцаў)***

Пачаргова ідуць
І з далёкіх часоў
Службу часу нясуць
Сем сясцёр і братоў.
***(Дні тыдня)***

Хто са мною пасябруе,
Той ужо не засумуе.
Языка хоць і не маю,
А пра ўсё апавядаю.
***(Кніга)***

Праводзіцца праверка.

Чаму пра кнігу можна сказаць, што з ёй ніколі не засумуеш?

Настаўнік звяртае ўвагу на выставу кніг М. Пазнякова.

Якія справы вы любіце рабіць разам з сябрамі? У якія гульні гуляць?

**Настаўнік.** А яшчэ я ведаю, што разам з сябрамі вы любіце чытаць, наведваеце бібліятэкі.

Падрыхтаваны вучань чытае верш "Мая бібліятэка":

Я ніколі не сумую —
Моцна з кнігамі сябрую.
Рады вам я пахваліцца,
Што ў мяне іх тры паліцы.
Ёсць Купала, Багдановіч,
Колас, Цётка, Броўка побач,
Караткевіч, Маўр, Лынькоў,
Пушкін, Прышвін, Міхалкоў.
Ёсць Маршак, Біянкі, Волкаў,
Ліндгрэн, Твэн, Радары, Толкін.
Ёсць і казкі ўсіх народаў,
Ёсць фантастыка, прыгоды.
На паліцах кніг палова
Пазнавальна-навуковых.
І калі часінку маю —
З асалодаю чытаю,
І сярод сяброў маіх
Шмат герояў гэтых кніг.
Дзень надарыцца няўдачны —
Не бядую і не плачу.
Супакой мой не ў аптэцы,
А ў маёй бібліятэцы.

(Можна запрасіць на мерапрыемства школьнага бібліятэкара, які раскажа пра карысць кніг.)

Якія правілы дапамогуць нам стаць добрымі сябрамі? Калі сябра можна назваць добрым чараўніком?

Пад песню "Каму вадзіць?" праводзіцца фізкультхвілінка.

**Урок роднай мовы**

Крылаў не мае,
Ды хутка лятае.
Выпусціш —
Рад ці не рад,
А не зловіш назад.
***(Слова)***

**Настаўнік.** Міхась Паўлавіч Пазнякоў працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры. У многіх яго творах прапануюцца цікавыя творчыя заданні для юных знаўцаў мовы.

***Гульня "Выпраў памылкі"***

Залівістыя песні па вясне
Кукуе нам сарока на сасне.
*(Зязюля.)*

Сена з лугу прыляцела
І ў хляве карову з'ела.
*(Карова прыйшла з лугу і ў хляве з'ела сена.)*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Люблю на санках летам
Прамчаць з гары крутой,
А ў садзе дыхаць кветам
Марознаю зімой.
*(Люблю на санках я зімой*
*Прамчаць з гары крутой,*
*А ў садзе дыхаць кветам*
*Пяшчотным цёплым летам.)*

Як вы разумееце слова “кветам”? *(Водарам духмяных кветак.)* Якія таямніцы адкрывае нам беларуская мова? Ці спатрэбяцца гэтыя веды ў жыцці? Навошта патрэбна вывучаць родную мову?

Вучань чытае на памяць верш “Родная мова”:

У горадзе,
Між ніў жытнёвых,
У важным доме,
Сціплай хаце
Не забывайце
Роднай мовы —
Для нас навек яна
Як маці.
Каб свет чароўнай прыгажосці
Вас ні на момант
Не пакінуў,
Шануйце мову
Не як госцю,
А як матулю,
Гаспадыню.

### Урок пашаны да Радзімы

**Настаўнік.** У кнізе “Гульняслоў” Міхась Паўлавіч Пазнякоў прапануе заданне “Матэматычная загадка”. Паспрабуйце яго выканаць — рашыць незвычайны прыклад.

**Б + К + Е - К + Л + Ф + А + О – Ф + Р – О + У +**
**+ Д – Д + С + Ь =** *(БЕЛАРУСЬ)*

Што вам уяўляецца, калі вы чуеце слова *Беларусь*?

**Настаўнік.** У творчасці Міхася Паўлавіча Пазнякова значнае месца займаюць творы, прысвечаныя Радзіме і памяці герояў Вялікай Айчыннай вайны.

Вучань выразна чытае верш “Юнаму сябру”:

Людзі зведалі гора замнога —
Лютавала калісьці вайна…
Але потым прыйшла Перамога,
Мір усім падарыла яна.
Пакрысе аціхала трывога
І загойвала раны вясна.
Гэта наша з табой Перамога,
Нам жыццё падарыла яна.
Не дапусцім ніколі такога,
Каб у полымі морам згараць.
Гэта наша з табой Перамога,
Будзем, дружа, яе шанаваць.
А сустрэнеш дзядулю старога,
Пакланіся яму, гэта ён
Ваяваў, каб прыйшла Перамога
І быў мірны наш дзень і наш сон.
Будзем помніць заўсёды герояў,
Звонка марыць і сонечна жыць,
Берагчы на зямлі дарагое
І Радзіму-матулю любіць.

Якія думкі ўзніклі ў вас у час гучання верша?

**Настаўнік.** Я спадзяюся, што вы яшчэ раз прачытаеце гэты твор напярэдадні Дня Перамогі 9 Мая.

У канцы нашых незвычайных урокаў у школе добрых чарадзеяў прапаную вам здаць творчы экзамен.

Настаўнік чытае верш М. Пазнякова, у пэўны момант робіць паўзу, задае пытанне. Адказ вучняў параўноўваецца з аўтарскім варыянтам.

✧ Колькі тонаў, колькі зыкаў
За акном празрыста-светлых!
Што за дзіўныя музыкі,
Што за казачны аркестр?!

Як вы думаеце, пра які казачны аркестр распавядае паэт?

<u>Адказ аўтара:</u>
Адчыняю з хаты дзверы,
Выбягаю басанож:
Не магу вачам паверыць —
Гэта цёплы, звонкі дождж.

Як вы лічыце, чаму аўтар параўнаў дождж з аркестрам?

✧ Хто ў зімовы дзень марозны
Упрыгожыў так бярозы:
На галінкі серабрыстыя
Начапіў шары агністыя?

Якія незвычайныя агністыя шары з’явіліся на бярозе зімой?

<u>Адказ аўтара:</u>
Апрануўся я — і з хаты.
Бачу — гэта снегіры:
Змайстравалі ўчора з татам
Мы кармушку на двары.

З чым у вершы параўноўваюцца снегіры? Як вы лічыце чаму? Ці можна сказаць, што хлопчык і яго тата — добрыя, клапатлівыя людзі? Чаму?

✧ Клічуць хлопчыкі:
— Сяргей!
Ты гуляць выходзь
Хутчэй!
Кніжку
Потым дачытаеш
І задачу дарашаеш…

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Што адбылося далей? Што адказаў хлопчыкам Сяргей?

Адказ аўтара:

— Не, сябры,
І вам не раю.
Перш я кніжку дачытаю,
А затым
Рашу задачу.
А пасля галоўных спраў
Час настане для забаў.

Куды клікалі хлопчыкі Сяргея? Ці спадабаўся вам адказ Сяргея? Чаму? Каму з вас захацелася стаць больш старанным вучнем? Хто адчуў жаданне дапамагаць бацькам па гаспадарцы? Ахоўваць прыроду? Дарыць людзям дабро, прыгажосць, спагаду?

Настаўнік (або аўтар) чытае верш "Тварыце, людзі, на зямлі дабро!":

Тварыце, людзі, на зямлі дабро,
Жыццё красой штодня мацуйце.
Не золата, брыльянты, серабро,
А сэрца чысціню шануйце.
Маліцеся жывільнай дабрыні
І злом душы не ачарніце,
Каб не смылець на праведным агні,
Адкрыта, шчыра, сонечна жывіце.
Маліцеся Прыродзе як святой,
Матулі, што пад сэрцам вас насіла,
Каханай, што расквеціла вясной,
І працы, у якой святло і сіла.
Не падыміце грознае рукі
На кветку, птушку, чалавека.
Мы гэтулькі спазналі за вякі
Балючых страт, пакут і здзекаў.
Цнатлівае, бясцэннае, яно
Ніколі не ўзыходзіць на падмане.
Ачысцімся мы праз дабро адно
І толькі праз яго Народам станем.

Да чаго заклікае нас паэт?

### V. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ.

У якую школу запрасілі нас сёння творы Міхася Пазнякова? Як гучала тэма ўрока? Якія ўрокі ў Школе добрых чарадзеяў вам найбольш спадабаліся? Ці сустракаліся вам у жыцці добрыя чарадзеі? Хто гэта? Каго мы можам назваць добрым чарадзеем?

**Настаўнік.** Вось які адказ дае на гэтае пытанне паэт у вершы "Тры чарадзеі".

Тры чарадзеі
На свеце жывуць.
Утрох яны сеюць,
Утрох яны жнуць.
Шчаслівую песню
Складаюць утрох,
Каб кожны
Спяваць яе весела мог.
І сонца ўсміхаецца
Ўсім траім,
Дапамагае руплівае ім.
Жадаем штодзённа
Бачыць мы іх,
Моцных, прыгожых,
Заўсёды траіх.
Тры чарадзеі
На свеце жывуць.
Іх Працаю,
Дружбаю,
Мірам
Завуць.

**Настаўнік.** Кожнаму з нас хацелася б, каб у жыцці сустракаліся добрыя чарадзеі. Давайце яшчэ раз успомнім, як імі стаць.

### VI. РЭФЛЕКСІЯ.

**Настаўнік.**
Вось рамонак прамяністы,
У пялёстках белых, чыстых,
З сонечнай усмешкай
Мне шапоча нешта...

У кожнага на парце — папяровыя рамонкі. Вучні запісваюць на пялёстках назвы любімых твораў М. Пазнякова.

**Настаўнік.** Пакажыце вашы рамонкі. Які вялікі букет у нас атрымаўся! Думаю, вам будзе прыемна з удзячнасцю ўручыць яго пісьменніку.

Гучыць песня "Тварыце, людзі, на зямлі дабро!". Вучні ўручаюць рамонкі пісьменніку.

**Настаўнік.** Дзякую вам за актыўную працу на ўроку і за выдатную падрыхтоўку да яго. Нашаму аўтару дзякуем за яго творчасць, за тое, што ён сёння прыйшоў да нас. Гасцям дзякуем за тое, што наведалі наш урок.

**І. А. БУТОРЫНА,**
ст. выкладчык кафедры беларускага і рускага мовазнаўства БДПУ імя М.Танка,
метадыст вышэйшай катэгорыі НІА;
**Г. С. БАРАНАВА,**
студэнтка III курса БДПУ імя М.Танка.

***Ад рэдакцыі.*** Відэасустрэча з пісьменнікам М. Пазняковым будзе змешчана ў мультымедыйным дадатку да часопіса "Пачатковая школа" ў № 9/2016.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ